флюіду (у асн. газу), які рухаецца пад вял. ціскам. Суправаджаецца ўтварэннем кратэраў, дыяметр варонкі якіх можа дасягаць некалькіх дзесяткаў і нават соцень метраў; выклікае прасяданне зямной паверхні. Часта Г. прыводзяць да пажараў і ліквідацыі свідравіны. 2) Выхад падземнай вады з ваданоснай пароды сканцэнтраваным струменем, які падымаецца вышэй за паверхню зямлі ці дно вадаёма.


С.І.**Грыцавец**

**ГРЫФЫ**, група буйных птушак атр. драпежных. Каля 20 відаў. Падзяляюць на Г. сапраўдных (14 відаў у бязлесных гарах і перадгор'ях Афрыкі, Паўд. Еўропы і Азіі) і Г. амерыканскіх, пашыраных ва ўсіх прыродных зонах Паўн. Амерыкі. Найб. вядомыя Г. сапраўдныя: чорны (Aegypius monachus), *сцярвятнік*, сіп белагаловы (гл. *Сіпы*), *барадач*; сярод Г. амерыканскіх: каралеўскі (Sarcoramphus papa), кондар (Vultur gryphus), кондар каліфарнійскі (Gymnogyps californianus; занесены ў Чырв. кнігу МСАП). На Беларусі выпадкова залётны від Г. чорны.

Даўж. каля 1 м, размах крылаў да 3 м. Галава і шыя голыя або ўкрытыя пухам. Крылы шырокія, доўгія, прыстасаваныя да працяглага лунаючага палёту. Лапы масіўныя, пальцы тоўстыя. Нясуць 1 яйцо. Жывяцца пераважна мярцвячынай. Карысныя як прыродныя санітары. Колькасць рэзка скарачаецца (асабліва ў Еўропе).



**Грыфы**: 1 — чорны; 2 — каралеўскі; 3 — кондар; 4 — кондар каліфарнійскі.

**ГРЫЦАВЕЦ** Сяргей Іванавіч (6.7.1909, в. Бараўцы Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. — 16.9.1939), двойчы Герой Сав. Саюза (22.2 і 29.8.1939). Скончыў Арэнбургскую ваен. школу лётчыкаў (1932), школу паветр. бою (1936). Лётчык-знішчальнік, камандзір авіязвяна, атрада, знішчальнага авіяпалка. Удзельнік вайны ў Іспаніі 1936—39 (збіў больш за 30 самалётаў ворага), у 1939 баёў на р. Халхін-Гол (збіў 12 самалётаў праціўніка, у адным з баёў выратаваў камандзіра авіяпалка). Загінуў у авіякатастрофе каля пас. Балбасава Аршанскага р-на Віцебскай вобл. У Мінску, Баранавічах, Балбасаве, в. Моўчадзь Баранавіцкага р-на яму пастаўлены помнікі.

**ГРЫЦАЙ** Аляксей Міхайлавіч (н. 7.3.1914, С.-Пецярбург), рускі жывапісец. Нар. мастак Расіі (1963), чл. АМ СССР (1964). Вучыўся ў Ленінградскай АМ (1932—39). Выкладаў у Маскоўскім маст. ін-це імя Сурыкава (1948—52 і з 1964; праф. з 1966). У творах развівае традыцыі рус. пейзажнага жывапісу: «У Жыгулях. Бурны дзень» (1948—50), «Летні сад» (1956), «Чорная вада» (1967). Аўтар твораў на індустр. тэму («Электрапечы», 1947), партрэтаў (групавы партрэт «Пасяджэнне Прэзідыума АН СССР», 1951). Дзярж. прэмія СССР 1951, 1952.

**ГРЫЦКАВІЧЫ**, вёска ў Нясвіжскім р-не Мінскай вобл., на аўтадарозе Нясвіж—Ляхавічы. Цэнтр сельсавета і комплекснага долевага прадпрыемства. За 25 км на ПдЗ ад Нясвіжа, 137 км ад Мінска, 12 км ад чыг. ст. Пагарэльцы. 630 ж., 254 двары (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Царква.

**ГРЫЦКЕВІЧ** Анатоль Пятровіч (н. 31.1.1929, Мінск), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (1986), праф. (1987). Скончыў мінскія мед. ін-т (1950) і пед. ін-т замежных моў (1955), БДУ (1958). З 1959 у Ін-це гісторыі АН Беларусі, з 1975 заг. кафедры Мінскага ін-та культуры (з 1993 Бел. ун-т культуры). Дырэктар навук. і даследчага Бел. ін-та Цэнтр. і Усх. Еўропы (з 1996). Даследуе гісторыю Беларусі перыяду феадалізму, прыватнаўладальніцкія гарады. Аўтар публікацый па гісторыі правасл. царквы і каталіцкага касцёла ў Беларусі, шляхецкага саслоўя, генеалогіі шляхты і выбранцаў, гіст. нарысаў пра Слуцк, нац.-вызв. рух у 1918—20.

*Тв.*: Слуцк: Ист.-экон. очерк. 2 изд. Мн., 1970; Частновладельческие города Белоруссии в XVI—XVIII вв.: (соц.-экон. исслед. истории городов). Мн., 1979; Социальная борьба горожан Белоруссии (XVI—XVIII вв.). Мн., 1975; Древний город на Случи. Мн., 1985; Вакол «слуцкага паўстання». Мн., 1987.

*Літ.*: А.П.Грыцкевіч: Бібліягр. паказ. Мн., 1994.

**ГРЫЦКЕВІЧ** Валянцін Пятровіч (н. 30.3.1933, Мінск), беларускі гісторык. Брат А.П.*Грыцкевіча*. Канд. мед. н. (1963). Скончыў Мінскі ін-т замежных моў (1955), Мінскі мед. ін-т (1956), гіст. ф-т БДУ (1957). У 1956—71 працаваў урачом у Беларусі і Ленінградзе, з 1971 у Ваенна-мед. музеі Мін-ва абароны СССР, з 1988 на кафедры музеязнаўства Санкт-Пецярбургскага ін-та культуры. Даследуе гісторыю медыцыны і геаграфіі Беларусі, гісторыю музеязнаўства, тэорыю і методыку гісторыі, гісторыю міграцыі бел. інтэлігенцыі. Адзін з арганізатараў і старшыня (з 1988) Бел. грамадска-культурнага т-ва ў Пецярбургу, чл. Саюза пісьменнікаў Беларусі, ганаровы чл. Міжнар. асацыяцыі беларусістаў.

*Тв.*: Путешествия наших земляков: Из истории страноведения Белоруссии. Мн., 1968; Шляхі вялі праз Беларусь. Мн., 1980 (разам з А.Мальдзісам); Нашы славутыя землякі. Мн., 1984; От Немана к берегам Тихого океана. Мн., 1986; С факелом Гиппократа: Из истории бел. медицины. Мн., 1987; Адысея наваградскай лекаркі: Саламея Русецкая. Мн., 1989; Якой быць беларускай гістарычнай навуцы // Полымя. 1992. № 5. *М.В.Нікалаеў.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ